ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар
па выхаваўчай рабоце
ўстановы адукацыі
“Мазырскі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт
імя І.П. Шамякіна”
__________С.М.Шчур
[illegible] 2024 г.

**ВОДЗЫЎ**
**апаніруючай арганізацыі ўстановы адукацыі**
**“Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”**
**аб дысертацыі Носік Алесі Анатольеўны**
**“Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне”,**
**прадстаўленай на саісканне вучонай ступені**
**кандыдата філалагічных навук**
**па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова**

**Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

У дысертацыйнай працы А.А. Носік мэтай даследавання з’яўляецца ўстанаўленне семантычных, структурных і функцыянальных заканамернасцей беларускага лексічнага кантынуума эмацыянальнай сферы чалавека. У адпаведнасці з пашпартам спецыяльнасці “10.02.01 – беларуская мова” (*Загад Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 13.11.2017 № 260*) дысертацыя адпавядае галіне даследавання “Сучасны стан сістэмы беларускай мовы, асноўныя тэндэнцыі і напрамкі развіцця слоўнікавага складу мовы. Асаблівасці эвалюцыі сістэмы беларускай мовы ў XX стагоддзі. Сучасныя тэндэнцыі развіцця слоўнікавага складу беларускай літаратурнай мовы”. З гэтага вынікае, што рэцэнзуемая дысертацыя адпавядае спецыяльнасці “10.02.01 – беларуская мова” і галіне філалагічных навук, па якіх яна прадстаўлена да абароны. Гэта ж пацвярджаецца матэрыялам, абранымі метадамі і структурай праведзенага даследавання.

**Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.**

Адпраўной тэарэтыка-метадалагічнай базай пры выкананні даследавання А.А. Носік заяўлена тэорыя дыферэнцыяльных эмоцый, згодна з якой кожная эмоцыя вывучаецца як асобны матывацыйны працэс, якім рэгулююцца паводзіны чалавека і яго кагнітыўная сфера. Эмоцыі разглядаюцца як псіхасацыяльная з'ява, якая прадстаўляе ўстойлівы інтарэс для цэлага шэрагу навук, а таксама як важная частка моўнай карціны свету, якая складваецца ў кожнага носьбіта той ці іншай мовы. У адпаведнасці з гэтым навуковым укладам дысертанта ў айчынную лінгвістычную навуку з'яўляецца вырашэнне задачы ўстанаўлення семантычных, структурных і функцыянальных заканамернасцей беларускага лексічнага кантынуума эмацыянальнай сферы чалавека, у прыватнасці: выяўленне корпуса намінацый са значэннем эмацыйнага стану чалавека і стварэнне на гэтай аснове «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека»; вызначэнне асаблівасцей функцыянавання субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных намінацый эмацыянальных праяў; класіфікацыя негатыўных і пазітыўных эмацыянальных намінацый; выяўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў корпусе эмацыянальных намінацый. Сукупнасць пералічаных вынікаў дазваляе іх ацэньваць як значны ўклад дысертанта ў беларускую лінгвістычную навуку.

Прадстаўленасць вынікаў дысертацыйнага даследавання А.А. Носік у навуковым друку таксама пакідае добрае ўражанне і колькасна складае 20 публікацый (артыкулы, матэрыялы навуковых канферэнцый і семінараў). У іх лік уваходзяць 5 артыкулаў у навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Патрабаванні па апублікаванасці вынікаў дысертацыі А.А.Носік, такім чынам, выконваюцца ў поўным аб'ёме.

Дысертацыя і аўтарэферат аформлены згодна з патрабаваннямі Інструкцыі ВАК як у плане зместу і навуковага апарату, так і ў адносінах да тэхнічнага боку.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі (з указаннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень.**

Дысертацыйная праца А.А. Носік прадастаўляе ў карыстанне спецыялістам новыя аб'ектыўныя сістэматызаваныя веды адносна важнага фрагмента моўнай рэчаіснасці – эматыўнага кантынууму беларускай мовы з пункту гледжання структуры, семантыкі і функцыянавання.

Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі заключаюцца ў наступным:

1) акрэслены прынцыпы лексікаграфічнага апісання эмацыянальна-

падзейнай лексікі беларускай мовы і прапанаваны спосабы яе лексікаграфавання;

2) распрацавана класіфікацыя негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху, а таксама пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і амбівалентнай эмоцыі здзіўлення;

3) выяўлены асноўныя мадэлі семантычнай дэрывацыі ў эмацыянальна-пачуццёвай сферы, заснаваныя на суадносінах зыходных і рэцыпіентных ЛСВ;

4) вызначаны асаблівасці функцыянавання субстантыўных, ад'ектыўных і дзеяслоўных эмацыянальных намінацый у мастацкім і публіцыстычным дыскурсах;

5) створаны першы ў лексікаграфічнай практыцы «Тлумачальны слоўнік намінацый эмацыянальнай сферы чалавека».

Спроба комплекснага даследавання лексікі эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове на аснове значнага па аб'ёме рэпрэзентатыўнага фактычнага матэрыялу (1100 лексічных адзінак, засведчаных у больш чым 2800 тэкставых фрагментах) у айчынным мовазнаўстве на ўзроўні дысертацыйнага даследавання зроблена ўпершыню, чым і абумоўлена навізна атрыманых вынікаў.

Вынікі дысертацыйнага даследавання А.А. Носік будуць садзейнічаць далейшаму вырашэнню актуальных задач сучаснай беларускай лексікалогіі, семасіялогіі і лексікаграфіі, стварэнню грунтоўнай тэарэтыка-метадалагічнай базы па вызначэнні асноўных прынцыпаў і механізмаў узаемадзеяння псіхалагічных, сацыяльных і моўных феноменаў.

Распрацоўка «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека» (Дадатак А) мае безумоўную сацыяльную значнасць, як і ўсякая праца па складанні слоўнікаў. Практычная значнасць рэцэнзуемай дысертацыі яшчэ і ў тым, што яе вынікі накіраваны на ўдасканаленне працэса выкладання сучаснай беларускай мовы, а таксама лінгвакультуралогіі, псіхалогіі і псіхалінгвістыкі, стылістыкі, філалагічнага аналізу мастацкага тэксту, лексікаграфічнай тэорыі і практыкі.

Такім чынам, ёсць падставы сцвярджаць, што дысертацыя А.А. Носік змяшчае навукова, практычна, эканамічна і сацыяльна значныя вынікі.

Вартым увагі мы лічым таксама дакументальна пацверджанае ўкараненне вынікаў дысертацыйнага даследавання ў вучэбны працэс УА "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт" (маецца акт укаранення).

**Заўвагі па дысертацыі.**

Разам з канстатацыяй несумненных дасягненняў дысертанта ў накірунку вырашэння пастаўленых мэты і задач адзначым і некаторыя

асобныя падыходы, якія выклікаюць пэўныя пытанні з прычыны небездакорнасці іх абгрунтавання ці спрэчнасці ў інтэрпрэтацыі тых ці іншых момантаў.

1. На наш погляд, вельмі шырока сфармуляваны аб'ект даследавання – "катэгорыя эмацыянальнасці ў сучаснай навуковай парадыгме". Нават з улікам таго, што ён канкрэтызаваны праз прадмет ("намінацыі эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове"), мовазнаўчая накіраванасць даследавання ў фармулёўцы аб'екта таксама павінна была б быць адзначана.

2. Улічваючы тое, што рознымі даследчыкамі, як вынікае з 1-й главы дысертацыі, прапаноўваюцца розныя (хоць і шмат у чым падобныя) спісы эмацыянальных праяў, характэрных для жыццядзейнасці чалавака, не цалкам зразумела, чаму дысертантам абраны менавіта такі спіс, які прадстаўлены ў рабоце (негатыўныя: *гора, гнеў, агіда, нянавісць, пагарда, віна, сорам, страх*; пазітыўныя: *радасць, цікавасць*; амбівалентная: *здзіўленне*). Прычым да амбівалентных аднесена, як бачым, толькі адна намінацыя – *здзіўленне*. Але, як заўважае сама дысертант у п. 3.3 "Сінкрэтызм у моўнай рэпрэзентацыі эмацыянальна-пачуццёвай сферы" (с. 96–101), сінкрэтызм, семантычная дваістасць можа быць уласціва і іншым намінацыям эмоцый (у самой дысертацыі, у прыватнасці, згадваюцца такія, як *радасць, журба, усміхацца* і інш.). Параўн. таксама: *інтарэс* (у "станоўчым сэнсе") vs. *нездаровы інтарэс*, напрыклад: *На думку спецыялістаў, трывожным сімптомам, разам з іншымі праявамі дэпрэсіі і дэзадаптацыі, з'яўляецца* <u>*нездаровы інтарэс*</u> *да тэм, звязаных з замагільнымі светам і жыццём, які назіраецца ў 15% навучэнцаў* (Звязда, 13.08.2017); *спакуса* – лексема, якая таксама разглядаецца аўтарам даследавання ў шэрагу станоўчых, але (разам з вытворнымі ад яе) не менш (а магчыма, нават больш) характэрна і для абазначэння адмоўнай з'явы, параўн.: — *Асцерагайся ж ты* <u>*спакусы*</u>*: / Прыйдзі хоць раз дадому ў часе! — / Звярнулась жонка да Міхася* (Я. Колас); *Не, Гаўрылавіч, не захварэў...* <u>*Спакуса*</u> *найшла... Д'ябал заўладаў мной...* (М. Зарэцкі); *Здрадзіў, бо не стрымаўся ад* <u>*спакусы*</u> (У. Карпаў) і г.д.

3. На працягу асноўнай часткі дысертацыі аўтар неаднаразова выкарыстоўвае такія тэрміны, як "семантычнае поле", "намінатыўна-фунцыянальнае поле", "субполе", "ядро поля", "перыферыя поля", "намінатыўная парадыгма" і г.д. Пры гэтым у рабоце дакладна не акрэслены ні змест гэтых паняццяў, ні ўвогуле тая канцэпцыя поля, якая прымаецца ў дысертацыі ў якасці адпраўной (ці гэта сінтэз некалькіх канцэпцый?; ці ўласна распрацаваны дысертантам падыход?). Зазначым, што ў першай главе дысертант спасылаецца на пэўных даследчыкаў, якія разглядаюць

лексічныя сродкі выражэння эмоцый у межах тэорыі поля (напрыклад, работы Л. А. Калімулінай), але ніякіх сваіх адносін да прапанаваных імі ідэй не выказвае.

4. З папярэдняй заўвагі вынікаюць некаторыя пытанні адносна кваліфікацыі тых ці іншых адзінак. Праілюструем іх двума прыкладамі. Першы – суадносіны лексем *гора* і *бяда*. У “Тлумачальным слоўніку сучаснай беларускай літаратурнай мовы” пад рэдакцыяй М.Р. Судніка і М.Н. Крыўко (3-е выд., Мінск: Бел. энцыклапедыя, 2002, 784 с.) (ТСБЛМ) знаходзім: *Бяда – 'Няшчасце, гора'* (ТСБЛМ, с. 99). Пры гэтым у “Слоўніку сінонімаў беларускай мовы” С.М. Шведава (Мінск: Сучаснае слова, 2004, 480 с.) (ССБМ) менавіта слова *бяда* падаецца як дамінанта сінанімічнага рада, параўн.: *бяда* — бядота, няшчасце, нядоля, гора… (с. 84); аналагічна і ў “Слоўніку сінонімаў і блізказначных слоў” М. Клышкі (Мінск: Выш. школа, 1976, 592 с.) (ССБС): *бяда – гора, няшчасце, ліха, ліхое, нядоля, бяздолле, нягода, зло…* (с. 74). Узнікае пытанне: чаму дысертант усё ж лічыць “базавай эмоцыяй” менавіта гора?

Другі прыклад тычыцца лексем *гнеў, злосць*. У ТСБЛМ гэтыя лексічныя адзінкі тлумачацца адна праз другую, параўн.: Гнеў – *'Пачуццё моцнага абурэння, злосці'* (ТСБЛМ, с. 154); Злосць – *'Пачуццё гневу, раздражнення'* (ТСБЛМ, с. 243). Згодна з ССБС менавіта *злосць* падаецца як дамінанта сінанімічнага раду, параўн.: *злосць – зласлівасць, гнеў, варожасць, непрыязнасць, непрыязнь, няласка, запальчывасць, нянавісць, лютасць; шал* (*разм.*) (с. 190). У той жа час у ССБМ сінанімічны рад пачынае слова *гнеў*, параўн.: *гнеў – абурэнне, раздражэнне, злосць* (с. 116). Як бачым, “прыярытэт” той ці іншай адзінкі зноў жа зусім не відавочны. Таму хацелася б усё ж даведацца, што схіляе аўтара дысертацыйнага даследавання да таго, каб лічыць намінацыяй “базавай эмоцыі” менавіта тую лексему, а не іншую (у другім прыкладзе – *гнеў*, а не *злосць*).

5. Паважаны даследчык таксама не ўдакладняе, якім чынам у дысертацыі фармулюецца семантыка даследуемых лексем, а таксама выдзяляюцца тыя ці іншыя класы сем (архісема, інтэгральная сема, інварыянтная сема і інш.). Відавочна, што гэта рабілася з апорай на слоўнікі, з прымяненнем метада кампанентнага аналізу, але якія крыніцы былі выкарыстаны і як ажыццяўлялася гэтая працэдура, трэба было б патлумачыць.

Падкрэслім, што шэраг зробленых заўваг і пастаўленых пытанняў маюць дыскусійны характар, могуць успрымацца як прыватныя пажаданні дысертанту, і ў сваёй сукупнасці яны значна не ўплываюць на адзначаную вышэй безумоўную навуковую і практычную вартасць дысертацыйнай працы А.А. Носік.

**Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка навуковай ступені, на якую ён прэтэндуе.**

Дысертацыя А.А. Носік з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай, якая выканана пад навуковым кіраўніцтвам доктара філалагічных навук прафесара В.Д. Старычонка. Яна адпавядае ўсім патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да дысертацыйных прац на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці "10.02.01 – беларуская мова", сведчыць аб кампетэнтнасці і навуковай сталасці даследчыка, які змог вырашыць дастаткова складаную і актуальную навуковую праблему – упершыню ў айчынным мовазнаўстве вызначыць корпус і ажыццявіць комплекснае даследаванне лексікі эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове ў структурным, семантычным і функцыянальным аспектах.

Лічым, што ў адпаведнасці з патрабаваннямі пунктаў 19–21 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў вучоная ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці "10.02.01 – беларуская мова" можа быць прысуджана Алесі Анатольеўне Носік за:

– выяўленне і сістэматызацыю корпуса намінацый са значэннем эмацыйных праяў чалавека (лексічных адзінак, у сэнсавых структурах якіх вылучаюцца эмацыянальныя семы) як неад'емнай часткі жыццядзейнасці чалавека і яго адносін з навакольнай рэчаіснасцю; устанаўленне фактаў перасячэння і ўзаемапранікнення асацыятыўных сэнсаў, ускладнення маральна-этычнымі, ментальнымі, духоўнымі, сацыяльнымі, міжасобаснымі, экспрэсіўнымі і іншымі прыметамі; састаўленне «Тлумачальнага слоўніка намінацый эмацыянальнай сферы чалавека»;

– вызначэнне асаблівасцей функцыянавання субстантыўных (прадстаўлены аддзеяслоўнымі, адад'ектыўнымі словамі і нематываванымі лексічнымі адзінкамі), ад'ектыўных (абумоўленасць канкрэтнай семантыкай назоўнікаў, з якімі яны спалучаюцца і выяўляюць абстрагаваныя эмацыянальныя прыметы, пэўныя эмацыянальныя станы) і дзеяслоўных (абазначэнне інтэнсіўнасці і экстэнсіўнасці, інгрэсіўнасці, дэлімітатыўнасці, каўзатыўнасці, накіраванасці ў прасторы, развіцці ў часе; словаўтваральная і формаўтваральная актыўнасць) намінацый эмацыянальных праяў, якія проціпастаўляюцца па катэгорыях «акцыянальнасць», «прадметнасць», «квалітатыўнасць»;

– распрацоўку класіфікацыі негатыўных эмацыянальных намінацый з інварыянтнымі значэннямі гора, гневу, агіды, нянавісці, пагарды, віны, сораму, страху (вызначэнне іх лексіка-тэматычных груп, якія адрозніваюцца колькаснай прадстаўленасцю лексічных адзінак і іх сінанімічных

адпаведнікаў, сферай выкарыстання, шырокай ці вузкай лексічнай спалучальнасцю, высокай ці нізкай ступенню выяўлення эмацыянальных станаў і адчуванняў, наяўнасцю ці адсутнасцю другасных ЛСВ і іншымі паказчыкамі);

– устанаўленне спецыфікі рэпрэзентатыўнасці пазітыўных эмоцый радасці, цікавасці і здзіўлення (прадстаўленасць невялікай колькасцю лексічных адзінак, якія характарызуюцца шырокай сігніфікатыўнай суаднесенасцю, сэнсавай разнавектарнасцю, адсутнасцю выразных крытэрыяў тлумачэння значэнняў слоў; вылучэнне сярод іх групы са значэннем радасці, цікавасці і здзіўлення, у межах якіх назіраецца пэўная градацыя семантыкі ў кірунку павышэння ступені інтэнсіўнасці і сілы выяўлення эмацыянальнага стану; выяўленне галоўнай тэндэнцыі развіцця такіх намінацый – іх актыўнага ўключэння ў дзеянне гіпанімічнай мадэлі, якая прадугледжвае дыферэнцыяцыю ЛСВ; выяўленне сумяшчэння ў межах адной сэнсавай структуры сінкрэтычных ЛСВ, якія ў пэўных кантэкставых сітуацыях могуць набываць як пазітыўную, так і негатыўную канатацыі);

– выяўленне спецыфікі семантычнай дэрывацыі ў корпусе эмацыянальных намінацый і асноўных семантычных мадэляў утварэння другасных лексіка-семантычных варыянтаў (утварэнне другасных ЛСВ па інварыянтнай мадэлі «канкрэтны фізічны працэс ці стан» → «унутраны эмацыянальны стан чалавека»; залежнасць псіхалагічных метафар ад крыніцы матывацыі, спецыфікі першасных ЛСВ, якія адлюстроўваюць рэальна існуючыя, фізічныя, відавочныя якасці і ўласцівасці; характарыстыку донарскай сферы і сферы-крыніцы ў метафарагеннай дзейнасці пры ўтварэнні другасных ЛСВ; функцыянаванне другасных псіхалагічных метафар у межах невялікіх тэкставых фрагментаў, накіраванае на павышэнне інфарматыўнасці выказвання).

**Рэкамендацыі па выкарыстанні вынікаў даследавання.**

Вынікі і матэрыялы дысертацыйнага даследавання А.А. Носік могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы новых напрамкаў даследавання эмацыйнай сферы чалавека ў дачыненні да мовы і маўленчай дзейнасці; у практыцы выкладання лексікалогіі і лексікаграфіі беларускай мовы, а таксама лінгвакультуралогіі, псіхалогіі і псіхалінгвістыкі (пры падрыхтоўцы спецкурсаў і семінараў, напісанні вучэбных дапаможнікаў і складанні вучэбных праграм, распрацоўцы адпаведнай тэматыкі курсавых, дыпломных і магістарскіх прац); пры складанні тлумачальных слоўнікаў беларускай мовы. Яны, безумоўна, будуць запатрабаваны ў навукова-даследчай і выкладчыцкай дзейнасці пры далейшай распрацоўцы грунтоўнай тэорыі першаснай і другаснай намінацыі.

**Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне Алесі Анатольеўны Носік “Лексіка эмацыянальнай сферы чалавека ў беларускай мове: структура, семантыка, функцыянаванне” адпавядае патрабаванням пп. 19–21 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў. Водзыў заслуханы, абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні навуковага міжкафедральнага семінара па актуальных праблемах беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна” 14 чэрвеня 2024 года (пратакол № 1).

На пасяджэнні навуковага семінара прысутнічала саіскальнік вучонай ступені А.А. Носік, якая выступіла з дакладам па тэме дысертацыі і вычарпальна адказала на пытанні прысутных.

На семінары прысутнічалі 1 доктар філалагічных навук (Кураш С.Б.) і 8 кандыдатаў філалагічных навук (Буркова Г.В., Лаеўская Т.Я., Мазуркевіч Л.М., Прахарэнка Л.В., Сергушкова В.У., Слівец В.Р., Сталярова А.М., Шаўчэнка М.М.). Вынікі галасавання членаў семінара, якія маюць вучоныя ступені: “за” – 9, “супраць” – 0, “устрымаліся” – 0.

Старшыня –
загадчык аспірантуры
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна
кандыдат філалагічных навук Г.В.Буркова

Эксперт –
прафесар кафедры
беларускай і рускай філалогіі
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна
доктар філалагічных навук
дацэнт С.Б. Кураш

Сакратар пасяджэння –
начальнік навукова-даследчага сектара
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна
кандыдат філалагічных навук В.Р.Слівец

В. Бурковай, С.Б. Кураша, В.Р. Слівец
В.Я. Дрынеўская
2024 г.